движения. Сегодня проводится активная работа по вовлечению школьников в ряды Всероссийского патриотического движения «ЮНАРМИЯ».

**Список использованных источников:**


1. Гарбар О.В. Опыт работы по гражданско-патриотическому воспитанию в муниципальном образовании «Дорогобужский район» Смоленской области / Инновационно-педагогические практики формирования компетенций культуры безопасности в процессе социальной реабилитации несовершеннолетних» / Монография с элементами методического пособия. Авт.-составители О.В. Дутова, Е.Б. Скачкова; Под. ред. Ю.Р. Лутфуллина. - СПб.: Фонд развития и поддержки молодёжи «Кадровый резерв», 2017. - С.22-24.
2. Программа семинара по распространению лучших методик и практик, выявленных в рамках семинара-практикума на тему: «Об опыте совместной работы органов образования, военных комиссариатов, Русской православной церкви, ДОСААФ России по подготовке молодежи к службе в рядах Вооруженных Сил Российской Федерации и защите Отечества» / Авт. Составители Ю.Р. Лутфуллин, М.М. Кислицкий, И.Т. Фазлаев; Под. ред. член корр. РАН А.Н. Сёмина. - М. Фонд развития и поддержки молодёжи «Кадровый резерв», 2014. - 108 с.


http://edoc.bseu.by/

*А. В. Худніцкая, канд. культуралогіі,*
*РІВШ, г. Мінск*
elen.g.minsk@gmail.com

# ПРАБЛЕМЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ Ў ІНТЭРНЭТ-ПРАСТОРЫ

Адным з найважнейшых фактараў фарміравання культурнай ідэнтычнасці асобы з’яўляецца рэпрэзентацыя культурных каштоўнасцей, якая абапіраецца на знаёмства з роднай культурай і гісторыка-культурнай спадчынай. Такое знаёмства традыцыйна звязваецца з экскурсійнай дзейнасцю, наведаннем музеяў і выстаў, прысвечаных спадчыне, а таксама вывучэннем спецыяльнай літаратуры. Аднак для сучаснага чалавека найбольш даступны сродак даведацца аб чым-небудзь – здзейсніць пошук у інтэрнэце. Стварэнне інтэрнэт-рэсурсаў, прысвечанных помнікам спадчыны і сучасным артэфактам культуры, падаецца відавочна актуальным. І калі для знаёмства з музейнымі экспазіцыямі або вядомымі помнікамі такія рэсурсы выступаюць як дапаможныя, то ў рэпрэзентацыі спадчыны, доступ да якой фізічна абмежаваны, яны могуць апынуцца асноўнымі.

На сённяшні дзень інфармацыя аб спадчыне Беларусі прадстаўлена ў інтэрнэт-прасторы фрагментарна. Па-за межамі рэалізаваных праектаў застаецца вялікая колькасць перыядаў развіцця культуры, тэм і калекцый – і гэта найважнейшае праблемнае поле рэпрэзентацыі спадчыны ў інтэрнэце.

Напрыклад, амаль не выкарыстоўваецца патэнцыял аб’ектаў, якія захоўваюцца музеямі, але не трапляюць у экспазіцыі. Так, у гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе» маецца ўнікальная калекцыя беларускага інсітнага мастацтва – маляваных дываноў (каля 200 адзінак), якая да гэтага часу не экспануецца, і пазнаёміцца з якой можна толькі праз падрыхтаванае спецыялістамі выданне [1]. На сённяшні дзень найбольш комплексны рэсурс, дзякуючы якому можна пабачыць прадметы больш чым з сотні музеяў краіны – дзяржаўны каталог музейнага фонду Рэспублікі Беларусь (http://www.dkmf.by/). Аднак гэты рэсурс у першую чаргу спецыялізаваны і не прызначаны для асветніцкай працы з рознымі аўдыторыямі.

А. А. Іназемцава прыводзіць іншы прыклад, звязаны ўжо з рэпрэзентацыяй артэфактаў сучаснай культуры, і адзначае слабае пазіцыянаванне ў глабальнай сетке творчасці сучасных беларускіх мастакоў, што звязана з адсутнасцю персанальных сайтаў у большасці мастакоў і даступных агульных платформ, здольных аб'яднаць матэрыялы па тэматыцы актуальнага беларускага мастацтва [2].

Многія помнікі, якія можна наведаць, застаюцца невядомымі, бо разбураны ці знаходзяцца ў аддаленні ад населеных пунктаў, а таму звычайна не ўключаюцца ў экскурсійныя маршруты і наведваюцца толькі аматарамі самастойных падарожжаў. Часцей за ўсё пра такія помнікі ёсць звесткі і выявы, з дапамогай якіх можна зрабіць віртуальную рэканструкцыю або выставу. Напрыклад, у 2021 годзе да шэрагу віртуальных рэканструкцый далучылася VR-экскурсія па Слонімскай сінагозе [3].

Тое ж датычыцца часткі страчаных матэрыяльных і нематэрыяльных помнікаў. Калі маюцца, напрыклад, архіўныя фотаздымкі стану архітэктурнага помніку да яго разбурэння, відэазапісы з выкананнем традыцыйных песень, яны могуць выкарыстоўвацца як віртуальныя экспанаты.

Выпадаюць з рэпрэзентацыі спадчыны і тыя аб'екты, што знаходзяцца за межамі краіны, у тым ліку ў прыватных калекцыях. Напрыклад, творы беларускіх мастакоў Парыжскай школы, інкунабулы, гістарычныя дакументы і інш. Для выкарыстання выяў і лічбавых копій гэтых помнікаў неабходна атрымаць дазвол ад праваўладальніка, што звязана з пэўнымі выдаткамі.

Другое праблемнае поле звязана з арганізацыяй трансляцыі спадчыны ў інтэрнэт-прасторы.

У першую чаргу – пытанне выбару формы рэсурса. Найбольш характэрная форма для беларускіх рэсурсаў – статычны ілюстраваны артыкул. Патэнцыял віртуальных выстаў, віртуальных візітаў, блогаў, гульняў, мабільных праграм, ботаў, аттракцыёнаў віртуальнай рэальнасці, тэматычных адукацыйных і асветніцкіх курсаў і іншых форм выкарыстаўваецца вельмі абмежавана.

Адзначым, што выбар формы трансляцыі – істотная частка канцэпцыі і дызайна будучага матэрыяла, якая павінна адпавядаць функцыям ствараемага рэсурса і выконваць іх найлепшым чынам пры даступных сродках. Кожны сродак і кожная форма трансляцыі спадчыны ў віртуальнай прасторы мае пэўныя ўласцівасці і адметнасці, якія розным чынам спалучаюцца з зацікаўленасцю і паводзінамі аўдыторыі, з адметнасцямі розных тэм і задачамі папулярызацыі (напрыклад, пазнаёміць з малавядомай спадчынай, паглыбіць веды, паўплываць на ідэнтычнасць асобы, сфарміраваць пэўную пазіцыю і адносіны да спадчыны ці асобных помнікаў, матываваць на пэўныя дзеянні – наведаць помнік ці музей, прыняць удзел у мерапрыемстве і інш.).

Іншыя арганізацыйныя пытанні звянаны з забеспячэннем працяглай змястоўнай і тэхнічнай падтрымкі створаных рэсурсаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Беларускія маляваныя дываны = Belarusian decorated carpets : альбом-каталог з фондаў гіст.-культур. музея-запаведніка «Заслаўе» / аўт. уступ. арт. і склад.: І. Арцем'ева, Ю. Малаш, А. Рак ; фота С. Плыткевіча. – Мінск : Рыфтур, 2005. – 63 с.

2. Иноземцева, О. А. Имиджевое позиционирование белорусского искусства в интернете / О. А. Иноземцева // Першы міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры : зб. матэрыялаў, Мінск, 5–6 мая 2016 г. / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. ; рэдкал.: А. І. Лакотка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 282–284.

3. В Беларуси впервые создана VR-реконструкция и виртуальный тур по слонимской синагоге XVII века [Электронный ресурс] // Блог Гродно. S13.ru – Режим доступа: http://s13.ru/archives/sinagoga-11. – Дата доступа: 29.03.2022.